УДК 821.161.3-2

# АПОВЕСЦЬ «ЛІСЦЕ КАШТАНАЎ» У. КАРАТКЕВІЧА ЯК АПАВЯДАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

**Макарэвіч Алесь Мікалаевіч**
прафесар кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.А. Куляшова»; доктар філалагічных навук, дацэнт

*На падставе тэарэтычных зыходных, вылучаных аўтарам дадзеных матэрыялаў, «Лісце каштанаў» У. Караткевіча характарызуецца як апавядальная гісторыя ў форме аповесці: а) вобраз апавядальніка як кампазіцыйна арганізуючы цэнтр твора; б) ступень дачынення апавядальніка да падзей мінулага; в) апавядальнікавы мэты; г) ступень адпаведнасці яго светапогляду і перакананняў аўтарскай пазіцыі.*

Кампазіцыйна арганізуючым цэнтрам апавядальнай гісторыі з'яўляецца вобраз апавядальніка, які ўзнаўляе праз успамін-распавед адно, некалькі або цэлы шэраг здарэнняў з уласнага жыцця ці жыцця знаёмых яму людзей.

Кампазіцыйныя паказчыкі гісторый, якія ўзнаўляе апавядальнік, могуць быць абумоўлены наступнымі асаблівасцямі: а) ступенню дачынення апавядальніка да падзей мінулага, якія ён узнаўляе ў рэальным мастацкім свеце, – назіраў ён адпаведныя падзеі ці быў іх удзельнікам, або чуў аб іх ад іншага інфарманта; б) мэтамі, якія ставіць перад сабой апавядальнік, узнаўляючы пэўную гісторыю з уласнага ці чужога жыцця; в) ступенню адпаведнасці яго светапогляду і перакананняў аўтарскай мастацка-філасофскай пазіцыі.

У апавядальнай гісторыі спалучаюцца дзве формы мастацкага свету твора: рэальная і рэтраспектыўная з перавагай, натуральна, апошняй; рэальная ж форма можа быць зведзена іншым разам да мінімуму: абазначана толькі прысутнасцю апавядальніка і яго распаведам як працэсам.

Рэальны мастацкі свет твора ў форме апавядальнай гісторыі можа мець разгорнутую кампазіцыю, свае стылёвыя асаблівасці і сэнсавы рух, цесна звязаны з падзеямі рэтраспектыўнага мастацкага свету.

Падзеі рэтраспектыўнага плана маюць свае асаблівасці іх узнаўлення. У адных выпадках гэта просты пераказ іх апавядальнікам (тут героі рэтраспектывы «жывуць» апасродкавана: у пераказе); у другіх выпадках узнаўленне мінулага адбываецца ў непасрэднай форме: героі рэтраспектывы «жывуць» яшчэ раз.

Рэальны і рэтраспектыўны мастацкія светы твора могуць сыходзіцца ў адной кропцы як вынік паступовага набліжэння падзейнай плыні рэтраспектывы да асноўнага факта рэальнага мастацкага свету твора: успаміну апавядальнікам гісторый з яго жыцця.

Аповесць «Лісце каштанаў» (1972, упершыню надрукавана ў час. «Маладосць», 1973).

Твор мае аўтабіяграфічную аснову. Летам 1944 г. У. Караткевіч разам з маці прыехаў у Кіеў, дзе яны пражылі некалькі месяцаў. Тут на той час жыла матчына сястра, муж якой (начальнік штаба чыгуначных войскаў 2-га Украінскага фронту) атрымаў у гэтым горадзе кватэру. Сам пісьменнік у эсэ «Сон аб тым, што было» адзначыў, што ў «Лісці каштанаў» прадстаўлена «голая праўда, за выключэннем пары нязначных адступленняў ад яе, зробленых дзеля праўды літаратурнай» [2, с. 413]. Некаторыя са згаданых у аповесці эпізодаў дакіеўскага Васількавага жыцця таксама суадносяцца з фактамі дзіцячых вандраванняў пісьменніка ў перыяд вайны («інтэрнат на Урале», «беспаспяховыя ўцёкі», пераезд з дзядзькам у «вялікі паўдзённы горад» і інш.).

У жанравых адносінах твор уяўляе сабой апавядальную гісторыю ў форме аповесці. Узнаўленне падзей пра захапленні, прыгоды і трагедыю сяброў ваеннага часу адбываецца праз аповед дарослага чалавека, які з замілаваннем, цеплынёй,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

скрухай і болем расказвае пра знаёмства, прыгоды і трагічнае расстанне з сябрамі яго ранняга юнацтва.

Асноўныя падзеі твора адбываюцца ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў Кіеве пасля вызвалення гэтага горада ад захопнікаў. Галоўныя героі аповесці – беларус Васіль Стасевіч (ён жа – ужо дарослы – выступае авядальнікам у творы), камандзір сяброўскай «гвардыі» Раланд Дзмітрэнка, «мужычок» Багдан Цар, «прыгожы» Яўген Кульба, дасужая Нонка Юніцкая, «бялявы» немец Карл Канецкі, яўрэй Навум Фінеес і самая малодшая з кампаніі Ліза. – Гэта падлеткі, якім «было па чатырнаццаць – пятнаццаць – шаснаццаць год», якія «проста не дагулялі ў галодным дзяцінстве», якія імкнуліся на фронт, каб далучыцца да змагання з ворагам, адпомсціць за ўласныя і блізкіх боль, горыч і страты.

Мастацкая прастора аповесці – гэта вуліцы Кіева і яго прадмесце. Кіеўскія падзеі, якія ўзнаўляе апавядальнік, адбываліся летам 1944 года – гэта быў час, як адзначае апавядальнік, «поўнай, нічым не закаламучанай волі».

«Лісце каштанаў» складаецца з трынаццаці частак, у кожнай з якіх узнаўляюцца намеры герояў аповесці, спробы і вынікі іх здзяйснення. Асноўныя падзеі твора разгортваюцца ў наступных эпізодах: знаёмства Васіля з Ролікам і яго сябрамі; пагром рэкламы на шкле хлебнага магазіна; сустрэча і гутарка з лейтэнантам, у выказванні якога агучваецца праблема памяці пра ваенныя ахвяры; планаванне Ролікавай «гвардыяй» змагання супраць бесчалавечных гульняў «падвальных» (каманды Гната – хлопцаў з Падвальнай і Чкалава); знішчэнне Ролікавым «атрадам» штаба-пячоры і канчатковы разгром банды «падвальных», якія «былі гадамі»: «гулялі ў расстрэл, штурхалі прыкладамі між лапатак безабаронных і слабых»; спробы Васіля, Роліка і Карла дабіцца кахання Нонкі і іх «помста пагардай» ёй, а таксама намаганні Нонкі прымірыць сяброў, кожны з якіх па-свойму кахаў яе; апошняя падрыхтоўка да ўцёкаў на фронт, якая стала трагедыяй не толькі для тых з сяброў, хто загінуў ад выбухаў у замініраваным яры, спрабуючы дастаць схаваную немцамі зброю, а і для Васіля, які застаўся жыць, несучы ў сваім сэрцы памяць пра страчаных дарагіх яму сяброў – Раланда, Карла, Навума, Багдана, Лізу.

У гэтых эпізодах праз кароткія ўспаміны хлопцаў узнаўляюцца некаторыя факты іх мінулага жыцця (высяленне з родных мясцін Карлавай сям'і, партызанства Васіля і Карла, Навумава знявolенне ў гета і інш.). Гэтыя факты і скупыя каментарыі да іх сведчаць пры вытокі непрымірымасці сяброў да гвалту і насілля ў ваенных гульнях «падвальных», да цынізму ў рэкламным надпісе на шкле хлебнай крамы, таксама – і гэта самае галоўнае – пра прычыны іх імкнення папасці на фронт і стаць побач з дарослымі ў змаганні супраць ворагаў. «А яны ж і загінулі толькі таму, што – хай сабе падзіцячы – збіраліся на вайну з [несправядлівасцю. – *А.М.*], каб яна хаця на хвіліну хутчэй знікла з зямлі» [1, с. 389].

Героі аповесці праяўляюць непрыманне цынізму (эпізод пагрому «вялізнай рэкламы на шкле» хлебнага магазіна, якая абразіла «падлеткаў да глыбіні душы» сваёй цынічнасцю (ч. II); спачуванне пакрыўджанаму, непрыманне бяздумнай і жорсткай гульні ў вайну (эпізод «расстрэлу» Лізы, ч. IV); здольнасць аддаць жыццё за любімага чалавека (адчуванні Васіля, ч. VIII); павага інтымных пачуццяў іншай асобы, ч. VIII); спагадлівасць (эпізод выратавання крата, якога мучылі «вялікі падлетак», ч. IX); адданасць сяброўству, каханню; чэснасць, імкненне да справядлівасці; клопат пра блізкага (рашэнне Роліка не браць Лізу з сабой у небяспечныя для яе ўцёкі на фронт, ч. IX); самаахвярнасць (імкненне Лізы, Васіля выратаваць сяброў, якім пагражала смерць ад выбухаў і сыпучага пяску ў яры, ч. XI) і інш.

Апавядальнік наступным чынам характарызуе Ролікаву каманду: «… якія мы былі маладыя, якія да святасці дурныя і якія бязглузда, па-боску чыстыя» [1, с. 354].

Цэнтральныя матывы твора – ваеннае дзяцінства, памяць у адносінах да ахвяр вайны, змаганне за справядлівасць, далучэнне падлеткаў да ўсеагульнай барацьбы з фашыстамі. Матыў памяці асабліва выразна агучаны лейтэнантам у канцы другога раздзела: «Цень гэтага [злачынстваў фашыстаў і іх ахвяр. – *А.М.*] пабачыш – у званы біць пачнеш. Пах адчуеш – не супакоішся, пакуль не торкнеш усіх носам…» [1, с. 328].

Матыў памяці і справядлівасці пранозліва гучыць у рэфлексіі апавядальніка з пяці фінальных абзацаў твора.

«Што зробіш? Змагары за справядлівасць – гінуць.

І вось яны ляжаць недзе там, «за краем чорнай вясёлкі», як кажуць нашы казкі. Пры жыцці лёс не даў ім прывязанасці тых, каго яны хацелі. Але цяпер яны разам. Цяпер яны ляжаць разам, звязаныя самай моцнай повяззю, якая ёсць на зямлі.

Я не так бы пакутаваў, каб не былі яны такімі чыстымі, такімі вернымі сябрамі, такімі надзвычайнымі і добрымі, такімі выдатнымі хлопцамі.

Пачынаюць аблятаць каштаны.

І ў гэты журботны час наша апаленае, спаленае, наша забітае вайной, наша знявечанае юнацтва заўсёды, заўсёды ўспамінаецца мне» [1, с. 389].

Назва аповесці яднаецца з вобразамі «пахілага старога каштана», які «высачэў на плато» (XI раздзел) і гэтага ж самага дрэва, толькі ўжо «выкарчаванага з корнем» (XII раздзел) ад разрываў мін у яры, у якім загінулі Васілёвы сябры. У першым выпадку гэты каштан, па словах Раланда, скіраваных да Лізкі, трымае пясок на плато. « – Ты глядзі, каштан жа яго трымае. Ён не пусціць [абвалу «пясчаных наносаў», што былі за ім. – А.М.]. Гэтым купам травець і травець» [1, с. 381].

У другім жа выпадку каштан, як і Раланд, Карл, Навум, Багдан, Ліза, стаў ахвярай выбухаў у замініраваным фашыстамі яры, пад абваламі плато ў якім загінулі падлеткі. Дрэва не спраўдзіла сцверджанне Раланда пра яго магутнасць – яно не ўтрымала пясок на плато. Пасля трагедыі, калі з абвалаў пяску дасталі «тое, што калісь было Багданам», на яго скалечанае цела «з кожным парывам дняпроўскага ветру ападалі жоўтыя змаршчакаватыя лісты з выкарчаванага з корнем старога каштана» [1, с. 387].

«Лістота асенніх каштанаў» нагадвае апавядальніку пра трагедыю яго дзяцінства; смерць сяброў, да якой ён меў ускоснае дачыненне, пра мінулы і цяперашні невыносны боль яго сэрца ад дарагой і незваротнай страты. У час назірання «лістоты асенніх каштанаў» апавядальнікава «сэрца разрываецца <…> ад балеснай тугі, ад незваротнасці ўспамінаў, ад спозненых шкадаванняў, ад непапраўнасці… ад нянавісці» [1, с. 309].

Такім чынам, аповесць «Лісце каштанаў» У. Караткевіча мае наступныя паказчыкі апавядальнай гісторыі: а) вобраз апавядальніка як кампазіцыйны стрыжань твора; б) асабістае дачыненне апавядальніка да падзей мінулага; в) выразнасць апавядальнікавых мэт; г) адпаведнасць светапогляду і пераканаyняў апавядальніка аўтарскай пазіцыі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Караткевіч, У. Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2015. – Т. 5 : Легенды. Навела. Паэма. Аповесць : 1960–1972. – С. 309–389, 535–539.
2. Караткевіч, У. Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. – Т. 12 : Эсэ-нарысы. – С. 411–420.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова